Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2014-05-23

Валянціна

РАЗДЗЕЛ З КНІГІ «ЖАНЧЫНЫ Ў ЖЫЦЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА»

У 2012 годзе ў выдавецтве «Чатыры чвэрці» выйшла мая кніга «"Донжуанскі спіс" Караткевіча», прысвечаная жанчынам, якія паўплывалі на жыццё і творчасць нашага класіка. Новыя звесткі падштурхнулі да падрыхтоўкі другога выдання. Але тэкст павялічыўся на трацінy, а шэраг раздзелаў быў грунтоўна перапрацаваны. Так паўстала другая кніга, якая называецца «Жанчыны ў жыцці Уладзіміра Караткевіча». Яна ўжо падрыхтавана да друку ў «Чатырох чвэрцях» і неўзабаве павінна пабачыць свет. 176 старонак, каляровая ўклейка з фотаздымкамі (некаторыя ніколі не друкаваліся). Калі ў першым выданні ішла гаворка пра 10 жанчын, дык цяпер — пра 13. Але галоўнае, што новае выданне ўтрымлівае шмат новых звестак. Прапаную чытачам «ЛіМа» ўрывак з кнігі: скарочаны варыянт раздзела, прысвечанага Валянціне Караткевіч, жонцы пісьменніка.

Дзяніс МАРЦІНОВІЧ

Фота Сяргея Панізніка

Злева направа: Міхась Забэйда-Суміцкі, Валянціна Караткевіч, Уладзімір Караткевіч, Вацлаў Жыдліцкі. Прага. 1972.

У 1967 годзе пісьменнік пазнаёміўся з Валянцінай Нікіцінай (дзявочае прозвішча Ватковіч). Яна нарадзілася 28 чэрвеня 1934 года ў Кыргызстане. Пра яе дзяцінства аўтару расказала Любоў Пятроўна Рабушка, якая вучылася з будучай жонкай Караткевіча ў адным класе.

«Валянціна Ватковіч, яе брат Генадзь і маці прыехалі ў Радашковічы пасля вайны, дзесьці ў 1946 — 1947 гадах, — узгадвае Любоў Пятроўна. — Яна прыйшла да нас у пяты клас. Маці Валянціны спачатку працавала ў пракуратуры. У адным доме знаходзіліся рэстаран, пракуратура і аднапакаёвая кватэра Ватковічаў. Аднойчы ноччу ў рэстаране выбухнулі газавыя балоны, і ўвесь будынак загарэўся. Туды збегліся суседзі. Да дома, які гарэў, было страшна падысці. Побач стаялі напаўапранутыя Валянціна і яе брат, якія трымцелі ад холаду і страху. Потым ім далі новую кватэру. Але ў маці не было спецыяльнай адукацыі, таму хутка яна апынулася на пасадзе загадчыцы клуба.

Валя вельмі вылучалася сярод нас усіх. З першага дня знаёмства адчувалася, што яна была нейкай асаблівай, натхнёнай, вельмі развітай і адукаванай. Яе галоўным, ды, напэўна, і адзіным хобі было чытанне. Яна так захаплялася, што яе нельга было адарваць ад кніг. Калі мы толькі пачыналі знаёміцца з класікай, яна чытала ўсё — і замежную, і рускую літаратуру. На сумных уроках трымала кнігі пад партай.

Першыя гады ў школе Валянціна вучылася сярэдне — на «тры» і «чатыры». Магчыма, прычына хавалася ў звычайных, нават сярэдніх настаўніках. Але потым нашым класным кіраўніком стаў Фёдар Янкоўскі, будучы вядомы вучоны, мовазнаўца, які выкладаў у нас беларускую мову і літаратуру. Мы ўсе падцягнуліся, прычым Янкоўскі рабіў заўвагі і даваў парады вельмі тактоўна. Ён выкладаў у нас у дзявятым і першай палове дзясятага класа, а потым з'ехаў у Мінск. Але за гэты час Валянціна падцягнулася. Усе думалі, што яна скончыць школу з медалём. Прычым не адна яна. У аблана паслалі дадзеныя на двух залатых і пяцёх сярэбраных медалістаў. Але там не маглі паверыць, што ў звычайнай школе можа быць такі высокі ўзровень. Таму на клас выдзелілі толькі два сярэбраныя медалі. І Валянціна засталася без яго».

Пасля заканчэння школы Валянціна паступіла на гістарычны факультэт БДУ. У 1956 годзе скончыла яго, працавала ў краязнаўчых музеях: раённым Аршанскім і абласным Брэсцкім. У тыя гады яна ўзяла шлюб, але неўзабаве развялася. Прозвішча Нікіціна яна захавала. Але пра свайго першага мужа імкнулася нічога не згадваць.

Потым Валянціна паступіла ў аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Археолаг Міхась Чарняўскі, які вучыўся там разам з Валянцінай, згадваў, што над сваім даследаваннем яна працавала ў Маскве. «Яна там была два гады, пісала дысертацыю, ну і стала адчуваць сябе трошкі масквічкай. Ну, а мы тут такія, правінцыя. І гэта ў яе трошачкі так праслізгвала ў размовах, адносінах. І наша начальства яе тут незалюбіла. Хаця яна дысертацыю ўжо зрабіла амаль што, назад яе не ўзялі — не трэба нам тут такая ганарыстая. Хай едзе, дзе была. І яна страшэнна забітая гэтым, што трэба ехаць у Брэст».

Якраз у 1964 годзе ў часопісе «Маладосць» выйшла аповесць Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». А Валянціна Браніславаўна вельмі любіла дэтэктывы. «І я кажу: слухай, я табе дам такі дэтэктыў, такі дэтэктыў, — успамінаў Міхась Чарняўскі.<…> — Я кажу — во дэтэктыў, каб, можа, на душы лягчэй было. Яна як села, дык аж да Брэста яго чытала».

У наступным, 1965 годзе Валянціна Браніславаўна абараніла кандыдацкую дысертацыю па археалогіі (дакладней, па паморскай культуры). Аднак вымушаная была працаваць у Брэсцкім педінстытуце на кафедры гісторыі КПСС. Пазней, тлумачыўшы гэту сітуацыю, Валянціна Нікіціна казала: «Захочаш есці — будзеш і такое выкладаць».

Наконт абставін знаёмства Валянціны і Уладзіміра існуе тры версіі. Згодна з першымі дзвюма (версіі Адама Мальдзіса і Міхася Чарняўскага), яно адбылося 2 лістапада 1967 года ў Брэсцкім педінстытуце. А вось тэатразнаўца Ізабела Гатоўчыц, грунтуючыся на ўспамінах Валянціны, пісала, што сустрэча адбылася ў цягніку Берлін — Масква. Будучыя муж і жонка ехалі ў адным купэ да Брэста. Прычым неўзабаве пасля знаёмства пісьменніка запрасілі на сустрэчу ў Брэст (відаць, менавіта пра яе вядуць гаворку А. Мальдзіс і М. Чарняўскі).

Любоў Рабушка таксама расказвала са слоў Валянціны, што сустрэча адбылася ў Брэсце на чытацкай канферэнцыі. І пазнаёміў іх Уладзімір Калеснік. «Думаю, што Валя спадабалася яму з першага погляду, таму ён і запрасіў яе», — кажа Любоў Пятроўна. Таму гэтая версія падаецца больш грунтоўнай.

У любым выпадку Валянціна прыняла запрашэнне Караткевіча. Яны разам паехалі на вяселле літаратуразнаўцаў Вячаслава Рагойшы і Таццяны Кабржыцкай, што цэлы тыдзень праходзіла ў Ракаве на лістападаўскія святы (адзначалася 50-годдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі). Першая рэакцыя некаторых знаёмых была не надта тактоўнай. Некаторыя «максімалісты» сказалі Валянціне за сталом прама ў вочы: «Раз дрэнна гаворыш па-беларуску, то ты яму не пара». Для аб'ектыўнасці трэба сказаць, што неўзабаве Валянціна Нікіціна вывучыла беларускую мову, прычым, паводле слоў А. Мальдзіса, стала размаўляць на ёй лепш за сваіх нядаўніх крытыкаў.

Але больш істотна было тое, што паміж Уладзімірам і Валянцінай расла ўзаемная сімпатыя. Вестка пра тое імгненна абляцела вузкае кола нацыянальнай інтэлігенцыі. 20 снежня 1967 года Ларыса Геніюш піша ў лісце да Зоські Верас: «Валодзя, здаецца, жэніцца на нейкай выкладчыцы з Брэсцкага пед Інстытута. Яна 5 дзён гасціла ў іх… Не веру таму Валодзі, цяжкая з ім гутарка ў гэтай справе». А 3 студзеня 1968 года да Ларысы Геніюш прыходзіць ліст ад Максіма Танка: «Сустрэў Калесніка, ад якога і даведаўся, што Уладзімір закахаўся ў Брэсце ў харошую дзяўчыну». 12 лютага 1968 года Геніюш зноў піша з Зэльвы Зосьцы Верас: «Зусім цёпла пагутарылі і з дзяўчынай Караткевіча. Яна ад іх ужо паехала, але прыслала мне пачку дэтэктывак, і відно, што ёй, беднай, нявесела… Што ў іх атрымаецца, не ведаю».

Паколькі закаханым хацелася бачыцца часцей, Валянціна вырашыла перабрацца ў Мінск. Спярша паспрабавала ўладкавацца ў Інстытут гісторыі Акадэміі навук, але туды яе не ўзялі. Тады Караткевіч парушыў свой прынцып (ні за каго не прасіць) і дапамог уладкаваць Валянціну ў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук. Таму летам 1969 года яна пераехала ў Мінск. Два гады таму Караткевіч атрымаў двухпакаёвую кватэру на вуліцы Веры Харужай, 48. Менавіта тут Уладзімір Сямёнавіч пасяліў Антона Косміча, галоўнага героя рамана «Чорны замак Альшанскі» (1979). Гэтую кнігу аўтар прысвяціў Валянціне: «В. К., якой гэты раман абяцаў дзесяць год назад, з удзячнасцю». Прычым сам Уладзімір Сямёнавіч жартоўна прызнаваўся, што паабяцаў ёй напісаць дэтэктыўны твор у першы дзень знаёмства.

Калегі запомнілі Валянціну «блакітнавокай у акулярах бландзінкай, крыху паўнаватай, але зграбнай, у маленькай чорнай класічнай сукенцы, якая ёй вельмі пасавала». Справай яе прафесійнага жыцця стаў удзел у стварэнні «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі». Як пісаў Адам Мальдзіс, тое, што зрабіла Валянціна Браніславаўна для падрыхтоўкі «Збору…», для таго, каб «ён ішоў «без купюр», можна смела назваць навуковым подзвігам, грамадзянскай мужнасцю. Яна бясконца ездзіла ў экспедыцыі, абараніла не адзін помнік архітэктуры, пісала сама артыкулы і брашуры і рэдагавала чужыя». За гэтае выданне ў 1990 годзе разам з іншымі аўтарамі Валянціна Караткевіч (пасмяротна) была ўзнагароджана Дзяржаўнай прэміяй БССР.

Пасля пераезду ў Мінск Валянціна жыла ў сям'і пісьменніка. Але з Уладзімірам яна не распісвалася. Шлюб, які «цягнуўся ўжо некалькі гадоў», быў зарэгістраваны толькі 19 лютага 1971 года. Валянціна, якая ўзяла прозвішча мужа, абмяняла сваю двухпакаёвую кватэру ў Брэсце на пакой у Мінску. Праз два гады гэты пакой разам з двухпакаёвай кватэрай Караткевіча па вуліцы Веры Харужай, 48 абмянялі на трохпакаёвую кватэру (па вуліцы Карла Маркса, 36). Там Валянціна, Уладзімір і маці пісьменніка жылі да сваіх апошніх дзён.

Як пісаў Адам Мальдзіс, у новай кватэры ў пісьменніка нарэшце «з'явіўся асобны кабінет для работы. Ажаніўшыся, Караткевіч стаў часцей адпачываць — у сваім любімымÁroktэбелі, а таксама ў Гаграх, Дубултах. Хоць і ўсялякае бывала ў жыцці, Караткевіч быў удзячны жонцы за яе паўсядзённыя клопаты».

Але чаму шлюб быў зарэгістраваны не адразу? «Валодзя тады збіраўся ў Славакію, дзе перавялі яго кнігу, — кажа Любоў Рабушка. — Хацеў узяць з сабой і Валянціну. Але калі сталі афармляць дакументы, паўстала пытанне: а які яе статус? Тады яны пайшлі і адразу распісаліся. Чаму гэта не зрабілі раней? Што тычыцца Караткевіча, дык адназначна адказаць складана. Адносна Валянціны, мяркую так. Яна вельмі яго любіла. А яшчэ мела перадавыя погляды. Таму не лічыла прынцыповым — іх адносіны афіцыйна зафіксаваныя ці не. Галоўнае — разам».

Зразумела, вобраз Валянціны прадстаўлены ў мастацкай літаратуры дастаткова сціпла. Са значных твораў пісьменнік прысвяціў ёй толькі раман «Чорны замак Альшанскі». Але мяркую, што Караткевіч нарэшце знайшоў у Валянціне свой ідэал і асабістае шчасце. Як вядома, існуюць жонкі пісьменнікаў рознага тыпу. Адны не прэтэндуюць на першыя ролі, займаюцца гаспадаркай, дзецьмі, перадрукоўваюць тэксты. Але некаторым творцам патрэбны побач чалавек, роўны яму. І зразумела, калі муж і жонка — творчыя людзі, нікому не хочацца сыходзіць у цень.

Дарэчы, у рэшце рэшт Валянціну Браніславаўну прыняло і бліжэйшае атачэнне пісьменніка. 5 ліпеня 1971 года Ларыса Геніюш пісала Раісе Жук-Грышкевіч: «Валя цудоўная як гаспадыня хаты. Гасцінная, мілая, вельмі культурная і даволі абаяльная, прыгожая. <…> Валя здзівіла мяне, бо гутарыць цяпер выключна на роднай мове».

Валянціне і Уладзіміру было адмерана крыху больш чым дзесяцігоддзе сямейнага шчасця. «Усю душу Валянціна аддавала навуцы і Караткевічу. Жыла яго справамі і творамі, яго працай, даглядала яго маму», — успаміналa Любоў Рабушка. Пра ўзаемаадносіны Валянціны і Уладзіміра сведчыць той факт, што пісьменнік цяжка перажываў хваробу жонкі. 8 ліпеня 1982 года, калі стан здароўя Валянціны Браніславаўны пагоршыўся і яе забралі ў шпіталь, Караткевіч напісаў верш «Ў бездарожжа для тых, каму шчасціць…». Стаўленне да жонкі бачна ўжо ў аўтарскай пазнацы: «Свет повен мною, як шар зямны вадою. // А я не магу падаць табе глытка вады».

Нарэшце, сам верш:

Ў бездарожжа для тых, каму шчасціць,
Дагарае ўначы маё сэрца…

Ты дала мне імгненнае шчасце,
Я табе даў за гэта бяссмерце.

І калі ты падзякаю, болем,
Азарыла мне прорвы сусвету,
Я сказаў:
«Больш, напэўна, ніколі
Мы на свеце не ўбачымся гэтым».

І табе — хай нас людзі рассудзяць —
Я зайздроснай аддзякую доляй:
Ты — ніколі — мяне не забудзеш.
Ты мяне не ўбачыш ніколі.

Ў ноч самоты, і ў цемры магілы
Будзе смага адна тваёй доляй:
Ты забыць мяне будзеш не ў сілах,
І са мною… ніколі.
Ніколі.

«Калі Валянціна захварэла, я наведвала яе ў Бараўлянах, — расказвала Любоў Рабушка. — Яна мужна пераносіла свае пакуты. Ведала свой дыягназ, але трымалася малайцом». 28 лютага 1983 года Валянціна Браніславаўна пакінула гэты свет. 25 ліпеня 1984 года Уладзімір Сямёнавіч рушыў услед за ёй.

Ужо пасля смерці Валянціны ўкраінскі пісьменнік Мікалай Амельчанка «спытаў у Валодзі, якой усё-ткі была яго жонка, бо сам Валю так і не ўбачыў. І ён адказаў сумна, крыху падняўшы галаву, гледзячы ў цёмнае неба, нібыта дзесьці там, у невядомай вышыні, убачыў яе:

— Яна не была прыгажуняю, але валодала дзіўнай духоўнай абаяльнасцю. Яна была каралевай духоўнасці...»